# Слова пра Янку Купалу

**Віртуальная выстава кніг, прысвечаных жыццю і творчасці Янкі Купалы з фонда бібліятэкі ім. Д. Р. Новікава Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі**






















## да 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы, народнага паэта Беларусі

Жыццё і творчасць народнага паэта Беларусі Янкі Купалы прыцягваюць пільную ўвагу даследчыкаў яшчэ з тых часоў, калі выйшла ў свет першая яго кніжка. І зараз можна з упэўненасцю сказаць, што ў беларускай літаратурнай навуцы існуе цэлая галіна, якая называецца купалазнаўствам. Гэта падцвярджаюць і тыя кнігі, што знаходзяцца на паліцах бібліятэкі імя. Д. Р. Новікава Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі і якія прысвечаны біяграфіі паэта і яго літаратурнай дзейнасці.

Трэба адзначыць, што кнігі гэтыя самыя розныя – ад невялікіх папулярна-пазнавальных брашур да сур'ёзных літаратуразнаўчых прац. Гэта выданні, у якіх сабраны цёплыя, усхваляваныя водгукі, цікавыя і трапныя выказванні аб паэце і яго паэзіі тых людзей, з якімі Купала быў знаёмы, і гэта кнігі энцыклапедычнага характару, у якіх даследуецца ўсё, што звязана з імем песняра.

Наяўнасць такіх кніг у нашым фондзе зноў нагадвае аб яго універсальнасці і рознабаковасці. Кожнаму чытачу, які захоча падрабязна даведацца аб фактах біяграфіі паэта, аб асаблівасцях яго мастацкага стылю гэтыя выданні стануць добрымі памочнікамі. Знаёмцеся з імі зараз і прыходзьце за імі ў бібліятэку акадэміі імя Д. Р. Новікава!




**У фондзе бібліятэкі захоўваецца выданне публічнай лекцыі, якая была прачытана Алесем Кучарам у Мінску. Лекцыю выпусціла выдавецтва Акадэміі навук Беларускай ССР у 1948 годзе. Гэта адно з самых ранейшых выданняў, якое прысвечана жыццю і творчасці Янкі Купалы, якое ёсць у нашай бібліятэцы.**







Для рускоязычного читателя в 1950 году в издательстве «Советский писатель» вышла книга Евгения Мозолькова «Янка Купала». Решением Совета Министров Союза ССР за эту книгу автору была присуждена Сталинская премия третьей степени за 1949 год. Книга была продублирована в Государственном издательстве БССР в 1952 году. Фото на следующем слайде.






Е. МОЗОЛЬКОВ

# ЯНКА КУПАЛА

ЖИЗНЬ
И
ТВОРЧЕСТВО

Белорусского
Отд. 928
Шифр К.92.8
Инв. №126128
Института

ГОСУДАРСТВЕННОЕ ИЗДАТЕЛЬСТВО БССР
*Редакция художественной литературы*
Минск 1952

У 1952 годзе літаратурны музей Янкі Купалы падрыхтаваў да друку зборнік матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці народнага паэта БССР Янкі Купалы. Кніга выйшла ў выдавецтве Акадэміі навук БССР.

Зборнік адкрывае вялікі ўступны артыкул Міхася Лынькова аб жыцці і творчасці паэта. Далей у кнізе змешчаны «Аўтабіяграфія» паэта і «З аўтабіяграфічных запісаў». У кнізе сабрана шмат успамінаў тых людзей, якія ведалі паэта, сустракаліся з ім – Якуба Коласа, Леакадзіі Раманоўскай (сястры паэта), Уладзіміра Луцэвіча, Яўгена Хлябцэвіча, Паўла Кавалёва і іншых.

У раздзеле «Творчасць паэта» змешчаны артыкулы, прысвечаныя яго літаратурнай дзейнасці. Гэта матэрыялы Валянціна Таўлая, Міколы Клімковіча, Пятра Ахрыменкі.

Яшчэ адзін раздзел кнігі ўтрымлівае дакументы і матэрыялы аб жыцці і дзейнасці народнага паэта Беларусі. І сёння, праз 70 год пасля выхаду гэтай кнігі, яе асабліва цікава пагартаць і пазнаёміцца з яе зместам.

На наступным слайдзе можна паглядзець,
як яна выглядае.






ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ
ЯНКІ КУПАЛЫ

# ЯНКА КУПАЛА

(ЗБОРНІК МАТЭРЫЯЛАЎ АБ ЖЫЦЦІ І ДЗЕЙНАСЦІ НАРОДНАГА ПАЭТА БССР ЯНКІ КУПАЛЫ)


Библиотека ...елорусской ... Академии
Отд. 928
Шифр К 9...
Инв. № 1150...



ВЫДАВЕЦТВА АН БССР
МІНСК 1952




ЯНКА КУПАЛА






ЯНКА КУПАЛА

У гэтым жа выдавецтве Акадэміі навук Беларусі ў 1953 годзе выйшла яшчэ адна кніга, прысвечаная літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы – «Янка Купала. Творчасць перыяду рэволюцыі 1905 – 1907». Напісаў яе Васіль Івашын. У ёй аўтар падрабязна разглядае вытокі творчасці паэта, яго літаратурна-эстэтычныя погляды, асаблівасці творчага метаду і стылю маладога Янкі Купалы.



ЯНКА КУПАЛА

У 1955 годзе літаратурны музей зноў падрыхтаваў да друку кнігу «Янка Купала. Зборнік матэрыялаў аб жыцці і творчасці паэта». У яго ўвайшлі артыкулы, вершы, успаміны і выказванні, якія з'явіліся ў сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння і дзесяцігоддзем з дня смерці народнага паэта. Зборнік складаецца з пяці раздзелаў: у першым змешчаны артыкулы аб жыцці і творчасці Янкі Купалы, у другім – успаміны і выказванні аб ім пісьменнікаў і чытачоў, у трэцім – вершы, прысвечаныя паэту, у чацвёртым – матэрыялы аб Літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску і аб яго філіяле ў Вязынцы, у пятым адлюстравана правядзенне купалаўскіх дзён у 1952 годзе.

На слайдах ніжэй можна паглядзець, як выглядае гэта кніга і пазнаёміцца з некалькімі вершамі, што прысвечаны паэту і змешчаны ў зборніку.






АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ
ЯНКІ КУПАЛЫ

# ЯНКА КУПАЛА

ЗБОРНІК
МАТЭРЫЯЛАЎ АБ ЖЫЦЦІ
І ДЗЕЙНАСЦІ ПАЭТА

Белорусской
Библиотека Академии
Отд. 928
Шифр К.92.я.к.
Инв.№ 189723

ВЫДАВЕЦТВА
АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
МІНСК 1955

## Янку Купалу

Хоць і няма між намі,
Дачасна смерць забрала,
Ты будзеш жыць вякамі
Вялікі наш Купала!

Ты будзеш песняй звонкай
У зорах серабрыцца,
Над вольнаю старонкай,
Над роднаю зямліцай.

У чыстых майскіх росах.
Што ночка настрасала.
У польных адгалосках
Ты будзеш жыць, Купала!...

*Міхась Васілёк*

## Ля помніка Купалы

Я люблю гэты помнік просты
Пад высокім зялёным шатром…
І нібы не было тае ростані
Пад аркестра журботны гром.

Ён такі-ж задуменны і блізкі,
Быццам песню вось-вось толькі
склаў
Пра будоўлі цудоўнага Мінска,
Пра красу нашых велічных
спраў…

Я гляджу на аблічча роднае,
Песню славы складаю з зарой:
–Ты заўсёды, пясняр наш,
з народам быў,
І народ будзе вечна з табой.

*Пімен Панчанка*




Пазнаёмімся з наступным выданнем, якое прысвечана паэту. Гэта альбом «Янка Купала. Жыццё і творчасць». Выйшаў альбом у Дзяржаўным вучэбна-педагагічным выдавецтве Міністэрства асветы БССР у 1959 годзе. Тэкст альбома шырока ілюстрыруецца шматлікімі фотаздымкамі, звязанымі з жыццём Купалы, рэпрадукцыямі карцін беларускіх масткоў, копіямі розных дакументаў, змешчаны таксама фота вокладак кніг твораў паэта, урыўкі з некаторых яго твораў, выказванні аб ім вядомых людзей.



ЯНКА КУПАЛА

Жыццё і творчасць

АЛЬБОМ

Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва Міністэрства асветы БССР

МІНСК 1959



«Паэзія Янкі Купалы – гэта не проста добрыя высокамастацкія вершы. Гэта – апрача ўсяго – своеасаблівая гісторыя жыцця беларускага народа з яго нoравамі і звычаямі, з яго думамі і спадзяваннямі, з яго барацьбой і перамогай».

М. Ісакоўскі. «Слова аб юбіляру»













**Гэта кніга выйшла ў выдавецтве Акадэміі навук БССР у 1960 годзе. Яна складаецца з двух раздзелаў, у якіх сабраны артыкулы аб жыцці і творчасці народнага паэта Беларусі.**





З. Бандарына

ОЙ, РАНА НА ІВАНА...

*Аповесць аб дзіцячых і юнацкіх гадах Янкі Купалы*

Дзяржаўнае выдавецтва БССР * Мінск * 1961
Рэдакцыя дзіцячай і юнацкай літаратуры

**Перад вамі вокладка аповесці аб дзіцячых і юнацкіх гадах Янкі Купалы, яго першых кроках на літаратурнай дарозе. Кніга выйшла ў Дзяржаўным выдавецтве БССР у 1961 годзе.**




Аўтар брашуры, беларускі крытык і пісьменнік І. Шарахоўскі расказвае аб жыццёвым і творчым шляху народнага паэта БССР. Брашура выйшла ў Таварыстве па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў Беларускай ССР у 1962 годзе у Мінску.







**Зборнік прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы. У яго ўваходзяць даследчыя працы, успаміны сучаснікаў, выказванні пісьменнікаў, грамадскіх дзеячоў, вучоных. Асобны раздзел складаюць рэдкія і цікавыя дакументы, многія з якіх друкуюцца ўпершыню. Кніга выйшла ў выдавецтве Акадэміі навук БССР у 1962 годзе.**




**У 1965 годзе цікавы альбом падрыхтавала выдавецтва «Народная асвета». Называецца ён «Купала. Жыццё і творчасць. Матэрыялы для выстаўкі ў школе». У альбоме выкарыстаны багаты ілюстратыўны матэрыял: фотаздымкі паэта і яго родных, ілюстрацыі да кніг, рукапісы вершаў паэта і іншае. Некалькі ілюстрацый змяшчаем на слайдзе ніжэй.**

15 мая (ст. ст.) 1905 года ў мінскай газеце «Северо-западный край» быў упершыні
надрукаваны верш Я. Купалы «Мужык».


№ 746. Воскресенье, 15 мая 1905 г. Годъ XX № 746. Воскресенье, 15 мая

Сѣверо-западный КРАЙ

ВЫХОДИТЪ

Минскій Городской Зимній Театръ.

СТРОИТЕЛИ ЖИЗНИ

Минскій лѣтній театръ.

Іудейскій Король Лиръ

Въ Минскомъ Общественномъ Собраніи

**Мужыкъ!**

Што я мужыкъ, усѣ тутъ знаюць,
И, якъ юсць гэты свѣтъ вялікъ,
Зъ мяне смяюцца—пагорджаюць,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

Читаць, писаць я не умѣю,
Ни ходзить гладка мой языкъ,
Бо только вѣчно ору, сѣю,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

Бо въ працы свой хлѣбъ добываю,
Бо зношу лайку и крыкъ,
И свята радка кали знаю,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

Галѣюць дѣци вѣкъ безъ хлѣба,
Подзерты жончинъ чаравикъ;
Не маю грошы, якъ потреба,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

Залѣушы потамъ горкимъ вочы,
Чи я малы, чи я старыкъ,
Працую якъ той волъ рабочы,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

...

И кажный, хто мяне спытае,
Начуе только адзинъ крыкъ:
Што хоць мной кажный пагорджае,
Я буду жыць!—бо я мужыкъ!

Я. Купала

**ТРИ СЫНА.*)**

Однажды нѣкій отецъ отдѣлилъ своего сына, подарилъ ему помѣстье и сказалъ ему: «Живи такъ же, какъ живу я, и ты будешь счастливъ».

Получивъ подарокъ, сынъ ушелъ и началъ жить въ собственное удовольствіе. «Отецъ велѣлъ мнѣ,—говорилъ онъ,—жить такъ, какъ живетъ онъ; а онъ живетъ весело, и я послѣдую его примѣру».

Такъ прошелъ онъ годъ, два, десять, двадцать лѣтъ. Онъ растратилъ ...

Мінская газета «Северо-западный край» ад 15 мая 1905 года, № 746, дзе ўпершыню быў надрукаваны верш Я. Купалы «Мужык».


Мужык!*)

Што я мужык, усе тут знаюць,
І як ёсць гэты свет вялік,
З мяне смяюцца, пагарджаюць,—
Бо я мужык, дурны мужык.

Чытаць, пісаць я не умею,
Ня ходзе гладка мой язык,
Бо толькі вечна ару, сею,—
Бо я мужык, дурны мужык.

Бо с працы хлеб свой дабываю,
Бо зношу лаянку і крык,
І свята радка калі знаю,—
Бо я мужык, дурны мужык.

Галеюць дзеці век бяз хлеба,
Падзёрты жончын чаравік,
Не маю грошы, я на патрэбу,—
Бо я мужык, дурны мужык.

*) Верш гэты быў надрукованы ў мінскай расейскай газэце „Северо-Западный Край", 15/V 1905 г. у № 746. Гэта першы мой выступ у беларускай літэратуры. Аўтар.

Рукапіс верша «Мужык».

У 1908 годзе, у Пецярбурзе, у беларускай выдавецкай суполцы «Загляне сонца і ў наша ваконца» выходзіць першы зборнік вершаў Я. Купалы «Жалейка».



Вокладка зборніка вершаў «Жалейка». 1908 г.

**На** вуліцы „Маладой Беларусі" вялікае свята! Сонца жывой, сапраўднай паэзіі заглянула ў ваконца цёмнай, беднай, але вялікай хаты беларускага народа...

Няхай ён будзе для беларусаў тым, чым быў Шаўчэнка для Украіны!..

У. Самойла, *з газеты «Минский курьер», 1908, № 112.*

„**Жалейка**" адлюстроўвала сабой той узлёт да самасвядомасці і надзеі, якія адпавядаў уздыму 1905 года.

А. Луначарскі.

**Першы** зборнік маіх вершаў быў двойчы канфіскаваны: першы раз — па распараджэнню Пецярбургскага камітэта па справах друку, а другі раз — па прапанове Віленскай адміністрацыі.

Я. Купала, *«З аўтабіяграфіі».*


Янка Купала на допыце ў следчага.

*Малюнак М. Беляніцкага.*







**Кніга Івана Навуменкі выйшла ў «Бібліятэчцы студэнта філолага» ў 1967 годзе (выдавецтва «Вышэйшая школа»). Аўтар сцісла, канспектыўна разглядае творчасць класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы, аналізуе яго ўплыў на творчасць іншых беларускамоўных паэтаў, такіх як М. Чарот, П. Броўка, А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка.**










**Кніга Янкі Шарахоўскага выйшла ў выдавецтве «Навука і тэхніка» у 1970 годзе. У ёй аўтар імкнуўся стварыць першую навуковую біяграфію народнага паэта, яна разгортваецца ў непарыўнай сувязі з літаратурнай і грамадскай дзейнасцю Купалы.**

**У кнізе ёсць новыя біяграфічныя факты, раскрыты псеўданімы паэта.**



ЎПРАЎЛЕННЕ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ» БЕЛАРУСКАЯ ССР

Навукова-метадычны савет па прапагандзе літаратуры і мастацтва

Ул. ЮРЭВІЧ

ЯНКА КУПАЛА — НАШ СУЧАСНІК

(Да 90-годдзя з дня нараджэння

Матэрыял у дапамогу лектару)

Мінск, 1972

У фондзе нашай бібліятэкі захоўваецца і невялікая брашура Уладзіміра Юрэвіча «Янка Купала – наш сучаснік. (Да 90-годдзя з дня нараджэння. Матэрыял у дапамогу лектару». Брашура выйшла ў таварыстве «Веды» Беларускай ССР у 1972 годзе. Выданне можна лічыць узорам публікацый па папулярызацыі ведаў ў 60-70 годы XX ст.







Альбом «Янка Купала. Жыццё і творчасць» выйшаў у выдавецтве «Народная авета» у 1972 годзе. Багата ілюстраваная кніга падрабязна знаёміць чытача з жыццёвым шляхам народнага паэта Беларусі.








Г. БЕРЕЗКИН

*

МИР
КУПАЛЫ

•

МЫСЛИ
И НАБЛЮДЕНИЯ

•

Авторизованный перевод
с белорусского З. Кражмальниковой

•

СОВЕТСКИЙ
ПИСАТЕЛЬ
МОСКВА 1973

Отд. 891.72
Шифр Б484м.к.
Инв. № 800625

**Книга белорусского критика Геннадия Березкина вышла в московским издательстве «Советский писатель» в 1973 году на русском языке. Критик рассматривает главные этапы творческой биографии Янки Купалы, обращая внимание на особенности его художественного стиля и образного мышления.**





ТАКІ
ЁН БЫЎ

УСПАМІНЫ
ПРА
ЯНКУ
КУПАЛУ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1975

Зборнік успамінаў аб паэце выйшаў у выдавецтве «Мастацкая літаратура» у 1975 годзе. У яго ўвайшлі ўспаміны вядомых пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў, грамадскіх дзеячоў, родзічаў і сяброў паэта. З іх расказаў перад намі паўстае грамадскае і чалавечае аблічча паэта. З пералікам аўтараў успамінаў можна пазнаёміцца на наступным слайдзе.



Я. КОЛАС
К. ЧОРНЫ
Л. РАМАНОЎСКАЯ
УЛ. ЛУЦЭВІЧ
А. ПОСАХ
П. МЯДЗЁЛКА
Я. ХЛЯБЦЭВІЧ
К. БУЙЛО
Б. ІРЫНІН
Т. КУЛЕША
К. ПУРОЎСКІ
А. АЛЕКСАНДРОВІЧ
М. ЛЫНЬКОЎ
П. ГЛЕБКА
М. ХВЕДАРОВІЧ
М. ЛУЖАНІН
УЛ. ДУБОЎКА
М. РЫЛЕНКАЎ
С. ШАМАРДЗІНА
З. АЗГУР
П. МАЛЧАНАЎ
Я. САДОЎСКІ
Э. МОДЗІН
А. МІРОНАЎ
М. ЦІХАНАЎ

П. ТЫЧЫНА
Т. МАСЭНКА
М. НАГНІБЕДА
І. МУРАТАЎ
С. КРЫЖАНІЎСКІ
Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ
А. ЯКІМОВІЧ
А. АСТРЭЙКА
УЛ. ЮРЭВІЧ
Я. МАЗАЛЬКОЎ
Г. КАРАВАЕВА
Ф. КУБКА
АЛЕСЯ
АЛЕКСАНДРОВІЧ
М. СІДЗЕРАВА
Т. ЦІЛЬВІЦІС
А. ВЕНЦЛАВА
І. КАНА
Я. РАМАНОВІЧ
В. КОЛЫЧАЎ
Б. ЕМЯЛЬЯНАЎ
М. МАШАРА
А. БЯЛЕВІЧ
П. КАВАЛЁЎ
К. ЕЛІСЕЕЎ
І. НАЯКШЫН

«Янка Купала! Два словы, простыя беларускія словы. А колькі выклікаюць яны ў нашых пачуццях, уяўленнях успамінаў, перажыванняў, звязаных з творчасцю, з яркім вобразам вялікага паэта»!

*Якуб Колас*

«…Паэзія Купалы чаруе людскія сэрцы сваім непаўторным ззяннем, сваёй чысцінёй і мужнаю праўдай, багаццем народных інтанацый, маладычнасцю і напеўнасцю».

*Анатоль Астрэйка*

«Ніякі час не сатрэ з памяці воблік гэтага незвычайнага чалавека-жыццялюба і вялікага паэта. Ніякія гады не сатруць з памяці яго цудоўную ўсмешку. Купалаўскую усмешку».

*Міхась Лынькоў*







**Кніга Янкі Шарахоўскага выйшла ў выдавецтве «Навука і тэхніка» у 1976 годзе. Аўтар выкарыстаў і сістэматызаваў шматлікія малавядомыя друкаваныя і рукапісныя крыніцы, матэрыялы з фондаў паэта, якія раскрываюць актыўную грамадзянскую і літаратурную дзейнасць Янкі Купалы.**









**У гэтай кнізе (выйшла ў 1982 годзе ў выдавецтве «Навука і тэхніка») на шырокім фоне грамадскага жыцця падрабязна праслежваецца жыццёвы і творчы шлях паэта. Даследванне грунтуецца на багатым фактычным матэрыяле з друкаваных крыніц і архіваў.**





УСПАМІНЫ
пра
ЯНКУ
КУПАЛУ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1982

**Чарговы зборнік успамінаў аб паэце выйшаў да яго 100-годдзя з дня нараджэння ў 1982 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Папярэднія зборнікі, з якімі мы вас ужо знаёмілі, не ўмясцілі ў сябе ўспамінаў усіх тых, каму пашчасціла блізка ведаць Янку Купалу.**

**У гэтай кнізе новыя штрыхі да партрэта народнага песняра Беларусі.**







**В 1982 году в издательстве «Молодая гвардия» в серии биографий «Жизнь замечательных людей» вышла книга известного белорусского поэта, критика и литературоведа Олега Лойки. Автор широко использовал документальный материал, архивные источники, воспоминания современников, показывая неотделимость судьбы великого поэта от исторической судьбы Беларуси.**









**«Янка Купала» – першая на Беларусі персанальная энцыклапедыя. У даведніку змешчана 3095 артыкулаў, якія падрабязна знаёмяць з творамі паэта, з людзьмі, якія яго акружалі, публікуецца шмат новых дакументаў і матэрыялаў. Кніга выйшла у 1986 годзе, у выдавецтве «Беларуская савецкая энцыклапедыя».**







Перад вамі вокладка рамана-эсэ «Як агонь, як вада…» вядомага беларускага паэта і літаратуразнаўцы Алега Лойкі. Кніга выйшла ў 1992 годзе у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Са старонак кнігі перад чытачамі ўстаюць абставіны жыцця Янкі Купалы, паўстае сам Паэт –
са сваімі думкамі,
марамі, пошукамі і пачуццямі.

*«Федэрыка Гарсія Лорка даў песнярам (сваім іспанскім калегам) такое вызначэнне. "Песняры, – сказаў ён, – гэта папросту медыумы, лірычныя ачагі нашага народа». Але ж падобнае выказванне ў немалой ступені стасуецца і да індывідуальнасці беларуса Янкі Купалы, які, адораны незвычайнай паэтычнай чуласцю, таксама з'яўляўся «лірычным ачагом» свайго народа, пракрокам яго долі».*

*Уладзімір Гніламёдаў*




**Кніга Уладзіміра Гніламёдава выйшла ў 1995 годзе ў выдавецтве «Народная асвета». У кнізе па-новаму асвятляецца творчая спадчына Янкі Купалы – ад першых вершаў да апошніх выступленняў. Выданне прадугледжана як дапаможнік для настаўнікаў, але будзе карысна для ўсіх, хто цікавіцца творчасцю народнага паэта Беларусі.**




Аснову другой кнігі зборніка «Купала і Колас, вы нас гадавалі» склалі неапублікаваныя дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Расійскага дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, а таксама шэрагу іншых музейных і архіўных устаноў Беларусі. Змешчаны дакументы пра святкаванне юбілеяў песняроў, увекавечанне іх памяці, выданне збораў твораў, стварэнне і дзейнасць літаратурных музеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Кнігу выпусціла выдавецтва «Літаратура і мастацтва» у 2011 годзе.

**Асаблівую цікавасць уяўляюць бібліяграфічныя даведнікі, якія таксама захоўваюцца ў фондзе бібліятэкі акадэміі. Прадставім іх вашай увазе.**




Адзін з іх быў падрыхтаваны аддзелам беларускай літаратуры і бібліяграфіі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна і выйшаў у 1953 годзе ў выдавецтве Аакадэміі навук БССР (складальнік – Н. Б. Ватацы). Даведнік знаёміць чытача з усімі арыгінальнымі кнігамі Янкі Купалы, якія былі выдадзены на той час. З крытычнай літаратуры аб творчасці паэта паказаны буйнейшыя і найбольш новыя кнігі і артыкулы. Завяршаюць даведнік звесткі аб мастацкіх творах, прысвечаных народнаму паэту Янку Купалу.




**Бібліяграфічны паказальнік «Янка Купала, Якуб Колас і Магілёўшчына» быў падрыхтаваны да 125-годдзя з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі аддзелам беларускай і краязнаўчай літаратуры Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна. Бібліяграфічны паказальнік адлюстроўвае сувязі паэтаў з літаратурным і мастацкім жыццём Магілёўшчыны. Выданне ўключае інфармацыю аб больш чым 750-ці дакументах на беларускай і рускай мовах. Геаграфічныя звесткі аб прыбыванні Якуба Коласа і Янкі Купалы ў нашым краі змешчаны ў выглядзе табліцы. Для зручнасці выкарыстання складзены імянны і геаграфічны дапаможныя паказальнікі.**







АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

ЯНКУ КУПАЛУ

Библиотека Белорусского Института
КНИГОХРАНЕНИЕ
Отд.
Шифр К 92
Инв. № 64972

ВЫДАВЕЦТВА АКАДЭМІІ НАВУК БССР
МІНСК 1949

**Нельга не ўспомніць яшчэ адну кнігу, прысвечаную Янку Купалу. Мы прадстаўляем вашай увазе адмысловы паэтычны зборнік, у якім сабраны вершы аб народным паэце Беларусі. Ён уключае ў сабе творы рускіх, казахскіх, таджыкскіх, украінскіх і іншых паэтаў шматнацыянальнага Савецкага Саюза. Гэты невялікі зборнік можна лічыць сапраўдным вянком памяці выдатнаму песняру беларускага народа. Кніга выйшла у выдавецтве Акадэміі навук БССР у 1949 годзе.**

**Вершамі-прысвячэннямі Янку Купалу мы завяршаем віртуальны расказ аб кнігах, што апавядаюць аб жыцці і дзейнасці класіка беларускай літаратуры.**
**Гэтыя выданні чакаюуь вас у бібліятэцы імя Д. Р. Новікава.**

Міхаіл Ісакоўскі

З народам ты вырас, спяваў для народа,
І ў сэрца народная песня запала.
Жыві-ж і працуй нам на доўгія годы.
Песняр Беларусі – Янка Купала!

Пераклад П. Пестрака

Максім Рыльскі

Хто быў цяплом вачэй яго сагрэты,
Той не забудзе іхняй цеплыні;
Ён вораг быў няпраўды і маны.
Ён рыцар быў высакароднай мэты.
Ён мовы беларускае алмаз
Граніў замілавана і чулліва.
Братам-народам паказаўшы дзіва.
Як паказаў калісь Шэўчэнка ў нас.
Ён навучыў нас шанаваць глыбока
Святыню працавітае рукі, –
І увайшоў наш Янка на вякі.
Як вобраз Беларусі яснавокай.

Пераклад П. Глебкі

Якуб Колас

...І вось абарваліся ніці.
Сыйшоў ты на вечны спакой,
Буйнейшы наш колас у жыце.
Наш дуб лугавы над ракой.
Спі, гусляру, спачывай –
Не забудзе цябе край.
Парваліся струны. Разбіты
Цудоўныя гуслі твае.
Краіна жалобай спавіта:
Байца-песняра не стае.
Спі спакойна, спачывай –
Не забудзе цябе край.

Віртуальную выставу падрыхтавала
Студнёва Марыя Міхайлаўна,
галоўны бібліятэкар
аддзела гуманітарна-асветніцкай
работы бібліятэкі імя Д. Р. Новікава